# На крылах нястрачанай памяці

**Па ўсёй краіне ў мінулым годзе адзначалася 120-годдзе з дня нараджэння вялікага паэта Максіма Багдановіча. Яго творчасць заўжды прыцягвала ўвагу гісторыкаў і крытыкаў і натхняла не адно пакаленне мастакоў. Сярод іх наша суайчынніца — кампазітар Аліна Безенсон. Яна не толькі напісала выдатныя творы паводле паэзіі М. Багдановіча, але і выступіла ў ролі аўтара музычнага праекта, прысвечанага памяці беларускага класіка. Канцэрт адбыўся ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі.**

**Інга ЛІПАЙ,**
**кандыдат мастацтвазнаўства,**
**старшы выкладчык кафедры харавога вакальнага мастацтва, намеснік дэкана факультэта музычнага мастацтва БДУКіМ**

У выкананні акадэмічнага хору (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Павел Шэпелеў) і сімфанічнага аркестра (дырыжор Юрый Караваеў) Белтэлерадыёкампаніі, а таксама салістаў Вольгі Рузінай, Святланы Даражок, Янаша Нялепы, Алега Кавалеўскага і Андрэя Кунцэвіча прагучалі буйныя творы беларускіх кампазітараў Андрэя Бандарэнкі, Аліны Безенсон, Вячаслава Кузняцова і Віктара Кісценя.

Уражлівай карцінай перад слухачом паўсталі паэтычныя вобразы М. Багдановіча, якія сімвалізуюць родны край, само аблічча паэта, яго жыццёвы лёс. Сумны адзінокі лясун (сімвал пушчанскага краю) яскрава ўвасоблены ў лірычнай кантаце "Ціхія песні" В. Кузняцова. Вобраз "птушкі-вяшчункі" шэрай зязюлі (сімвала народнапесеннай паэзіі) адлюстраваны ў кантаце "Ціхі вечар" В. Кісценя. Галоўнай адметнасцю лірыка-драматычнага канцэрта "У краіне светлай" Андрэя Бандарэнкі сталася суровая карціна народнага жыцця, любоў да роднага краю.

Толькі не птушкай-прарочыцай і сумным маркотным лесуном паўстае перад намі постаць Максіма Багдановіча. Яго сімвал — "Страцім-лебедзь", моцны, горды птах, які і натхніў Аліну Безенсон на стварэнне аднайменнай драматычнай араторыі.

Яшчэ адзін опус А. Безенсон на вершы М. Багдановіча гучаў у той вечар: паэма "Над морам" для барытона, хору, фартэпіяна, арфы і ўдарных інструментаў. Абодва творы аб'ядноўвае бунтоўны вобраз нязгоднага падпарадкоўвацца плыні жыццёвых падзей.

Араторыя "Страцім-лебедзь" стала сапраўднай кульмінацыяй усяго канцэрта. Яе задума ўзнікла яшчэ ў 1994 годзе, але працаваць над творам кампазітар пачала значна пазней. Партытура была завершана ў 2001-м і адразу атрымала высокую адзнаку такіх мэтраў нашага нацыянальнага музычнага мастацтва, як Віктар Роўда і Генадзь Праватараў. Менавіта пад іх кіраўніцтвам у 2003 г. быў здзейснены запіс араторыі ў студыі Дома радыё. Праз год адбылося сцэнічнае ўвасабленне: прэм'ера прайшла ў Гродне ў выкананні камернага хору (кіраўнік Ларыса Іконнікава) і сімфанічнага аркестра (дырыжор Уладзімір Борматаў) Гродзенскай гарадской капэлы і мела каласальны поспех у слухачоў.

Вось і падчас філарманічнага канцэрта араторыя нікога не пакінула абыякавым, тым больш што да гэтага часу яна была значна дапрацавана. Сродкамі музычнага выяўлення А. Безенсон здолела засяродзіць увагу на значна шырэйшым сэнсе аповесці — прызначэнні сапраўднага мастака самааддана працаваць дзеля праслаўлення свайга народа. Падобна да галоўнага героя Страцім-лебедзя, які адмовіўся ад Ноева каўчэга і трагічна загінуў, ратуючы іншых птушак, М. Багдановіч таксама заўчасна пакінуў жыццё, да апошняга змагаючыся за нацыянальную самасвядомасць землякоў-беларусаў. Глыбіні чалавечай душы працінаюць пранікнёныя радкі "ад усіх цяпер патомкі ёсць, ды няма адных — Страцімавых".

Сапраўды, для прадаўжэння роду неабходна мець нашчадкаў. Але гэтага недастаткова. Важна ўсведамляць, што гісторыя кожнага народа складаецца з яго сацыякультурнай памяці. Бесперапынны працэс асэнсавання назапашанага творчага досведу не дае растварыцца айчыннаму мастацтву ў распаўсюджанай маскультуры. Да захавання нацыянальнай спадчыны ўвесь час імкнуўся Максім Багдановіч, а гэты працэс сёння працягваюць сваёй творчасцю сучасныя мастакі.

***На здымку: кампазітар Аліна Безенсон ля афішы канцэрта.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ